**ДУК “Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**

**Аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі**

**Сектар інфармацыйна-бібліяграфічнай работы**

# *КАЗЛОЎСКІ МІКАЛАЙ РЫГОРАВІЧ*



## *(ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)*

## ШОРТ-ЛІСТ

Пінск, 2025

Мікалай Рыгоравіч Казлоўскі нарадзіўся 25 кастрычніка 1935 г. у г. Пінску. Яго бацька, Рыгор Іванавіч Казлоўскі, «за польскім часам» працаваў вартаўніком на лесапілцы, ахоўваў панскі лес на Міхайлаўскім возеры. Дзяцінства Мікалая прыпала на цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага аднаўлення. Закончыў сярэднюю школу № 3. Займаўся ў студыі выяўленчага мастацтва Дома піянераў, а потым у Доме народнай творчасці.

З 1953 г. Мікалай Казлоўскі вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы на жывапісна-педагагічным аддзяленні. З другога курса быў прызваны ў Савецкую армію. У 1957 г. дэмабілізаваўся і працягваў вучобу. У 1961 г. абараніў дыплом і вярнуўся ў Пінск.

Да 1967 г. працаваў на фанерна-запалкавым камбінаце, а потым перайшоў працаваць у СШ № 3 настаўнікам выяўленчага мастацтва. Працаваў па прафесіі 34 гады, выхаваў тысячы дзяцей, прывіў ім эстэтычны густ, прывёў асноўныя законы выяўленчага мастацтва. Настаўнік вышэйшай катэгорыі. Узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі БССР (1977).

З 1986 г. Мікалай Казлоўскі стаў актыўна займацца жывапісам і графікай. Працаваў у жанрах пейзажа і партрэта, нацюрморта і бытавога жанру, прытрымліваўся стылю рэалізму. Значная частка творчасці мастака прысвечана роднаму гораду, ён пастаянна звяртаўся да гісторыі Пінска і Пінскага Палесся, маляваў помнікі культавай і грамадзянскай архітэктуры, сучасны стан краю. Другая значная тэма – гераізм савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Карціны мастака-краязнаўца – сапраўдная энцыклапедыя Пінска, пра іх казалі: «Гісторыя вачамі мастака».

Сумесна з рэдакцыяй газеты «Пінскі веснік» выпусціў набор паштовак «Утраченные храмы Пинщины». Ім былі створаны альбомы графічных работ: «Каменное зодчество Пинского Полесья XVII–XX вв.», «История моего города», «На берегах Пины», «Свято-Успенский Лещенский монастырь», «Древний Пинск», «Огинский канал», «Памятники Пинщины», «Пинское Полесье». Да 2000-годдзя хрысціянства рэдакцыя газеты «Пінскі веснік» выдала набор паштовак «Утраченные храмы Пинщины» па малюнках М. Р. Казлоўскага.

Займаўся ілюстрацыяй кніг. Выканаў малюнкі для кніг паэзіі Тамары Лазнюхі «Незамерзающий причал» (2002), «Зов дорог» (2003), Георгія Шэўмера «Сказка седой старины» (2006).

Мікалай Рыгоравіч з'яўляўся ўдзельнікам шматлікіх выстаў мастацкіх і графічных работ, сярод якіх Усесаюзная выстава графікаў СССР у Брэсце (1962), абласная выстава «60 гадоў БССР» (1978). Прымаў удзел у выставах групы пінскіх мастакоў «Арт-факт». Правёў персанальныя выставы ў Мазыры, Мінску. Рэгулярна арганізоўваліся персанальныя выставы мастака ў розных установах роднага Пінска. У гарадскім Доме культуры адбыліся яго тэматычныя выставы «Днепровцы» (2016), «Солдаты Победы» (2018), «Фронтовые подруги» (2021), прысвечаныя ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны.

У Музеі Беларускага Палесся ў Пінску захоўваюцца работы М. Р. Казлоўскага: «Село Николаевщина. Родина Я. Коласа», «Вечер на Нёмане», «Пинск. Вид костёла со стороны реки», «Река Струмень у Пинска», «Полесский пейзаж. Телеханы» і інш. Работы пінскага мастака знаходзяцца ў Расіі, Італіі, Індыі, Германіі, Нарвегіі, Польшчы, ЗША, Францыі, Эстоніі, Латвіі.

Мікалай Рыгоравіч Казлоўскі памёр 7 студзеня 2022 г. У красавіку работнікі Музея Беларускага Палесся падрыхтавалі ў памяшканні Пінскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі выставу ў памяць мастака. Былі прадстаўлены карціны з серыі «Стары горад». На адкрыцці выставы прысутнічалі родныя, сябры, вучні Мікалая Рыгоравіча.

**БІБЛІЯГРАФІЯ:**

1. Николай Козловский. Живопись. Графика : каталог 2010 / автор проекта И. Либерман ; фото Е. Таламая. – Пинск : Пина Принт, 2010. – 20 с. : ил.

2. Шевмер, Георгий Васильевич. Сказка седой старины : стихи / Г. Шевмер ; иллюстрации Н. Г. Козловского. – Минск : Логвинов, 2006. – 28 с. : ил.

3. Лознюха, Тамара Петровна. Зов дорог : стихи / Лознюха Т. П. ; [художник Козловский Н. Г.]. – Брест : Брестская типография, 2003. – 140 с. : ил.

4. Козловский, Николай Григорьевич. Утраченные храмы Пинщины : Памятники христианской культовой архитектуры XVII – XX вв. : комплект из 14 открыток / Н. Г. Козловский, В. Л. Ильенков. – Пинск : Пінскі веснік, 2000.

5. Козловский Николай Григорьевич // Учитель вечен на земле Полесской / [автор-составитель И. А. Кибак]. – Минск : Тонпик, 2005. – С. 127–128.

6. Козловский Николай Григорьевич : деятели культуры, науки и искусства Пинщины // На ладонях Припяти и Пины : литературный альманах / [автор-составитель И. А. Кибак]. – Минск : Тонпик, 2004. – С. 125–126.

7. Казлоўскі Мікалай Рыгоравіч : мастакі / С. Шапіра // Памяць. Пінск : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск : БЕЛТА, 1998. – С. 508.

8. Парасевич, Д. Палитра истории / Дарья Парасевич ; фото автора // Пінскі веснік + Полесская правда. – 2023. – 7 ліпеня (№ 27). – С. 17 : фот.

9. Памяти учителя, друга, пинчука / Вестниковцы ; фото Вячеслава Ильенкова // Пінскі веснік. – 2022. – 14 студзеня (№ 2). – С. 12 : фот.

10. Ильенков, В. Л. "Фронтовые подруги" Николая Козловского / Вячеслав Ильенков ; фото автора // Пінскі веснік. – 2021. – 14 мая (№ 20). – С. 20 : фот.

11. Ильенков, В. Л. Николай Козловский: "Служу городу и искусству" / Вячеслав Ильенков ; фото автора // Пінскі веснік. – 2020. – 23 кастрычніка (№ 85). — С. 12 : фот.

12. Владимирова, А. Подарок к юбилею города : [о выставке пинского художника Николая Козловского в выставочном зале Музея Белорусского Полесья] / Анна Владимирова ; фото Павла Куницкого // Полесская правда. – 2017. – 9 сентября (№ 72). – С. 12.

13. Денисович, И. Городские пейзажи пинского мастера : [о выставке пинского художника Николая Козловского в выставочном зале Музея Белорусского Полесья] / Ирина Денисович ; фото Анны Веренич // Пінскі веснік. – 2017. – 5 верасня (№ 71). – С. 6.

14. Гришковец, В. Ф. Родному городу посвящается... : [о выставке пинского художника Николая Козловского в выставочном зале Музея Белорусского Полесья] / Валерий Гришковец // Заря. – 2017. – 2 сентября (№ 99). – С. 7.

15. "Днепровцы" : [о выставке "Днепровцы" пинского художника Н. Козловского в городском Доме культуры] // Полесская правда. – 2016. – 21 мая (№ 41). – С. 2.

16. Ильенков, В. Л. Галерея славы напомнила о Третьяковке... на дому : [о выставке "Днепровцы" пинского художника Н. Козловского в городском Доме культуры] / Вячеслав Ильенков ; фото автора // Пінскі веснік. – 2016. — 17 мая (№ 40). – С. 2.

17. Куницкий, П. Встреча сквозь десятилетия : [пинскому художнику Н. Козловскому – 80 лет. В рисунке на опоре от старого моста он узнал своего отца] / Павел Куницкий ; фото автора // Полесская правда. – 2015. – 24 октября (№ 85). – С. 11.

18. Гришковец, В. Ф. Город его вдохновения : [о выставке пинского художника Николая Козловского, приуроченной к его 80-летию] / Валерий Гришковец // Заря. – 2015. – 22 октября (№ 120). – С. 13.

19. Ильенков, В. Л. История глазами художника : [о выставке живописных работ пинского художника Николая Козловского в выставочном зале Музея Белорусского Полесья] / Вячеслав Ильенков ; фото автора // Пінскі веснік. – 2015. – 9 кастрычніка (№81). – С. 12.

20. Гришковец, В. Ф. "Фронтовики" Николая Козловского : [в Пинском городском Доме культуры открылась выставка портретов "Фронтовики" Н. Козловского] / Валерий Гришковец // Заря. – 2015. – 26 февраля (№ 22). – С. 4.

21. Выставка Николая Козловского [Электронный ресурс] : [видео] // ТРК Брест. – Режим доступа: https://vkvideo.ru/video-57622564_456257569?ref_domain=yastatic.net

*Педагог, художник, краевед, коренной пинчук – всё это о Николае Козловском. В музее Белорусского Полесья открылась выставка работ известного мастера и учителя.*

22. Энциклопедия Пинска глазами Николая Козловского. К 85-летию известного художника [Электронный ресурс] : [видео] // ТРК Пинск. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=v6dr8Bbr2MY

*85-летний юбилей отмечает старейший пинский художник, коренной житель столицы Полесья Николай Григорьевич Козловский.*

Выканаўца:

Каваленка Я. У., бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Пінскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі
Ліпень 2025 г.